«Вясна» — экстрэмісцкае фармаванне.
Што трэба ведаць?

Падтрымай "Вясну" на PATREON

На 630 рублёў аштрафаваная бабруйчанка Любоў Санкевіч

19.07.2016 **Тэгі**: суды, адміністратыўны пераслед, акцыі, свабода мірных сходаў



Любоў Санкевіч. Фота Радыё Свабода.

У судзе Цэнтральнага раёна гораду Мінска 18 ліпеня суддзя Наталля Вайцэховіч па выніках адміністрацыйнага працэсу аштрафавала на 30 базавых велічынь (630 руб.) бабруйчанку Любоў Санкевіч.

Яна абвінавачвалася ва ўдзеле ў недазволенай акцыі, што 31 сакавіка на сталічнай плошчы Свабоды правялі 15 актывістаў Грамадзянскай ініцыятывы супраць беззаконня ў судах і пракуратуры – пенсіянеры і інваліды з розных рэгіёнаў краіны дзеля таго, каб дамагчыся дыялогу з чыноўнікамі, якія даюць адпіскі на звароты грамадзянаў. Пра гэта паведамляе "Новы час".

За гэты пікет усяго былі аштрафаваныя пяць пенсіянераў, у тым ліку бабруйчанкі **Валянціна Каваленка і Любоў Санкевіч**, жыхар райцэнтру Крупкі з Мінскай вобласці **Барыс Бабок**, мінчанкі **Тамара Сяргей і Камелія Чарняўскай** агулам на 130 базавых велічынь (2.730 руб. ці 1.365 долараў ЗША).

У каментары НЧ юрыстка **Тамара Сяргей** звярнула ўвагу на тое, што штрафныя санкцыі, якія накладаюць беларускія суды, становяцца важнай крыніцай папаўнення бюджэту. «За адну гадзіну знаходжання на плошчы Свабоды грамадзяне павінны заплаціць дзяржаве суму, эквівалентную 1.365 доларам», — сказала праваабаронца.

Яна зазначыла, што судовыя працэсы толькі па форме адпавядалі нормам працэсуальнага права.

> *«Аднак па сутнасці нашыя справы не былі разгледжаны суддзямі. Пра гэта сведчыць той факт, што суддзі адмовіліся разглядаць незаконныя дзеянні Мінгарвыканкаму, які адмовіў нам у правядзенні пікетавання. Насуперак незаконным дзеянням чыноўнікаў мы рэалізавалі сваё канстытуцыйнае права на пікетаванне. А прыцягненне нас да адказнасці сведчыць пра тое, што замест вырашэння праблемаў грамадзянаў дзяржава запалохвае людзей»,* — сказала праваабаронца.

На яе меркаванне, суд у каторы раз прадэманстраваў сваю залежнасць ад выканаўчай улады. «Калі б суды ў Рэспубліцы Беларусь былі па-сапраўднаму незалежныя і падпарадкоўваліся толькі закону, дык прыцягнулі б да адказнасці не нас, а чыноўнікаў Мінгарвыканкаму», — падкрэсліла Тамара Сяргей.

Опубликовать







Паказваў "Вікторыю" на Маршы. Мужчыну асудзілі да 2,5 гадоў "хатняй хіміі" па "народным" артыкуле

Двух сябровак асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у акцыі пратэсту ў 2020 годзе

Мужа і жонку Каражан асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у акцыі пратэсту

У рэгіёнах Міншчыны праводзяць пікеты ў "падтрымку выбараў". Разбіраемся, што з імі не так



ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА

"У мяне не было магчымасці супраціўляцца інакш". Маналогі затрыманых на антываенных акцыях два гады таму

"Турмы ў турме": захаванне правоў зняволеных ў ізалятарах, карцарах і ПКТ — праблемы і выклікі

"У ПК-1 палітвязняў прымушаюць закапваць будаўнічае смецце і спальваць адкіды". Былы вязень указаў месцы на мапе

Запрашаем на канферэнцыю! Штрафны ізалятар, карцар, ПКТ: інструмент выпраўлення ці знявагі?









АПОШНІЯ НАВІНЫ

Выбары*2024. Папярэдняя аналітычная справаздача па выніках назірання за выбарамі дэпутатаў у адзіны дзень галасавання 25 лютага 2024 года (дакумент)

"Разгубленасць і бездапаможнасць". Што распавядаюць былыя палітвязні пра фатаграфаванне ў калоніях (фота)

Метамарфозы суда: дальнабойшчыка абвінавачвалі за падрыў петарды, але асудзілі за ўдзел у экстрэмісцкім фармаванні

Мінімум 12 затрыманых: што вядома пра рэйд КДБ на адвакатаў

Заява аб прызнанні Васіля Палякова палітычным зняволеным

Заява аб прызнанні сямі чалавек палітычнымі зняволенымі

Бацьку траіх дзяцей асудзілі да года калоніі за каментары ў

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Студзень 2024

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Выбары*2024

ВЫДАННІ





Напрамкі дзейнасці

ПАРТНЁРСТВА





















СЯБРОЎСТВА







#BYSOL

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

